WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

25 МАЯ 2010 г. АЎТОРАК № 99 (26707)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## Аб выбранні Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пастанаўляе:**

1. Выбраць Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Рубінава Анатоля Мікалаевіча.

2. У сувязі з выбраннем Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Рубінава Анатоля Мікалаевіча вызваліць яго ад пасады намесніка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

**Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Л. КРУПЕЦ**

*24 мая 2010 года, г. Мінск., № 241 — СР4/IV*

## Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь РУБІНАЎ Анатоль Мікалаевіч



Фота БЕЛТА.

Рубінаў Анатоль Мікалаевіч нарадзіўся 15 красавіка 1939 года ў г. Магілёве.

У 1961 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І. Леніна.

Працоўную дзейнасць пачаў у Інстытуце фізікі Акадэміі навук БССР, дзе працаваў больш за 40 гадоў. Прайшоў шлях ад аспіранта да намесніка дырэктара па навуковай рабоце Інстытута фізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выконваў абавязкі акадэміка-сакратара Аддзялення фізікі, матэматыкі і інфарматыкі Акадэміі навук БССР.

У 1965 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1972 годзе — доктарскую. У 1980 годзе яму прысвоена вучонае званне прафесара.

У 1991 годзе выбраны акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Член Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Аўтар больш як 300 навуковых работ, 4 манаграфій і 65 вынаходніцтваў. Пад яго кіраўніцтвам распрацаваны арыгінальныя лазерныя прыборы, адзначаныя дыпломамі і медалямі ВДНГ і ўдастоеныя залатога медаля Міжнароднага Лейпцыгскага кірмашу.

Анатоль Рубінаў падрыхтаваў больш за 30 кандыдатаў і дактароў навук.

З 2002 па 2006 год узначальваў Вышэйшую атэстацыйную камісію Рэспублікі Беларусь, з 2009 года — член гэтай камісіі.

З 2006 па 2008 год — першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У кастрычніку 2008 года выбраны членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання ад горада Мінска, 31 кастрычніка гэтага ж года — намеснікам старшыні Савета Рэспублікі.

Намеснік старшыні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Камітэта па дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь.

Заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР (1980). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1972) і Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1994).

Узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны, юбілейным медалём «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

24 мая 2010 года выбраны старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

## Аб выбранні намесніка Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пастанаўляе:**

1. Выбраць намеснікам Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Крупца Леаніда Фёдаравіча, выключыўшы яго з членаў Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні.

2. З Пастановы Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ад 31 кастрычніка 2008 года № 18 — СР4/I «Аб выбранні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 266, 4/5788) пазіцыю «Крупец Леанід Фёдаравіч» выключыць.

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А. РУБІНАЎ**

*24 мая 2010 года, г. Мінск., № 242 — СР4/IV*

## Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь КРУПЕЦ Леанід Фёдаравіч



Фота БЕЛТА.

Крупец Леанід Фёдаравіч нарадзіўся 18 лістапада 1956 года ў в. Макашы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці.

Скончыў Універсітэт Дружбы народаў імя П. Лумумбы, вучоны-аграном, перакладчык з іспанскай мовы.

Працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам Беларускага навукова-даследчага інстытута аховы раслін, аграномам-тэхнолагам Гарадзейскага цукровага камбіната, інструктарам, загадчыкам арганізацыйнага аддзела Нясвіжскага райкама КПБ, намеснікам старшыні Нясвіжскага раённага Савета дэпутатаў, першым намеснікам старшыні, начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Нясвіжскага райвыканкама, старшынёй Нясвіжскага райвыканкама, першым намеснікам старшыні Мінскага аблвыканкама, памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўным інспектарам па Віцебскай вобласці.

З 2007 года — старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.

У кастрычніку 2008 года выбраны членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання ад Мінскай вобласці, з'яўляўся членам Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейным медалём «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

24 мая 2010 года выбраны намеснікам старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

Асабістая гаспадарка

# МАЛАДАЯ ГАСПАДЫНЯ І ДЗЕЦІ З КУБКАМІ НА ФОНЕ КАРОВЫ

**АЛЕНА Магілеўцава — 32-гадовая жыхарка аграгарадка Родня ў Клімавіцкім раёне. Калі б гэтая стройная вяскоўка з блакітнымі вачыма і белазубай усмешкай нарадзілася бліжэй да сталіц, то, можа, сёння яна б упрыгожвала тэатральныя падмосткі ці эстраду. Але жыццё распарадзілася так, што ўраджэнка беларуска-расійскага памежжа стала жывёлаводам, шматдзетнай маці і дбайнай гаспадыняй уласнага падворка.**



### На вуліцы Сонечнай

У кветніку Алены расцвіў блакітны акопнік, чыстыя слоікі блішчаць на плоце, на градах у агародзе не знайсці ніводнай лішняй травінкі. Акуратнасць і парадак у вясковай гаспадыні, якая разам з мужам гадуе пяцярых(!) дзяцей, уражвае. Такую чысціню не навесці нават працяглым генеральным прыбіраннем, яе трэба падтрымліваць штодня.

Муж Валерый сёння працуе на ферме. Старэйшыя дзеці, 10-гадовы Купрыян і 7-гадовы Лук'ян (імёны атрымалі з сялянскага радаводу), вучацца ў школе. Тры дачкі — Ніна, Алена і Надзея, малодшай з якіх 3 гады, ціха гуляюць каля дома і не турбуюць дарослых. А маці расказвае пра сямейнае жыццё і падсобную гаспадарку.

— Я нарадзілася на Хоцімшчыне. Паехала паступаць у Магілёў на швачку, але так да вучобы і не прыступіла: маці захварэла, выпала вяртацца. З Валерам пазнаёмілася з дапамогай радыёперадачы «Клуб знаёмстваў»: проста напісала яму ліст, і вось ужо за мужам 7 гадоў. Прыехалі ў Родню, таму што тут ёсць праца і жыллё.

У маці Алены было 7 дзяцей, у Валерыя — 10 братоў і сясцёр. Цяпер у мужа і жонкі — пяцёрка малых!

— Маці расказвала, як раней жылі, калі не было ніякай дапамогі, — дзеліцца жанчына. — Рабілі вялікую бочку і садзілі туды дзяцей, клалі ежу і цацкі. А калі з працы прыйдзеш, то ў той бочцы невядома што робіцца... А цяпер тры гады дома сядзі і гадуй, ёсць дзіцячы садок. Не, ніякай бочкі ў мяне няма! Раджаць і гадаваць дзяцей — гэта для мяне няцяжка.

Алена ўдзячная за дапамогу з боку дзяржавы. Яна пералічвае: грошы на дзяцей, адрасная дапамога, бясплатнае дзіцячае харчаванне, гуманітарная дапамога. Аднак як бы там ні было, асноўны цяжар кладзецца на бацькоў. А калі заробак у жывёлавода не перавышае 400 тысяч рублёў, то даводзіцца шукаць іншы шлях выжывання. Гэты надзейны шлях — асабістая падсобная гаспадарка.

### Сырадой — ласунак

— Дабіраем гаспадаркай і агародам, — пацвярджае Алена. — Праўда, прадаць нічога не атрымліваецца. Сям'я вялікая — усё самі спажываем. Сёння ў гэтай гаспадарцы — поўны набор жывёлы: карова, конь, свіння, куры, гусакі, трусы.

— Усё для гаспадаркі ёсць. Галоўнае тут — не спаць. Пад'ём — а 4-й гадзіне, і ўвесь дзень на нагах.

Карова цяпер тройчы на дзень дае па 10 літраў малака. Тварог, сыр, кефір, малочны суп, бліны — з малака можна шмат чаго прыдумаць! У малых Алены любімы ласунак — не шкодныя чыпсы з газіроўкай, а суперкарысны для здароўя сырадой з-пад каровы. Таму дзеці, узброеныя кубкамі і пячэннем, першымі бягуць да Красулі.

— У вёсцы без агарода і жывёлы цяжка пражыць, — разважае Алена. — Хоць, калі заробак быў бы больш за мільён рублёў...

— А што такое мільён на 7 чалавек? — уступае ў гутарку старшыня Раднянскага сельскага Савета Васіль Іванавіч Саламацін.

Васіль Іванавіч працуе на пасадзе два дзясяткі гадоў, сам трымае падсобную гаспадарку, таму эканоміку сельскай сям'і ведае добра.

СТАР. 2

# ДЗЯКУЮЧЫ ТАЛЕНТАМ ЛЮДЗЕЙ, БЕЛАРУСЬ ЗДОЛЬНАЯ ЗАНЯЦЬ ЛІДЗІРУЮЧЫЯ ПАЗІЦЫІ Ў СВЕЦЕ

Падтрымка адоранай моладзі з'яўляецца ў Беларусі справай дзяржаўнай важнасці і прызначана для ўсіх дзяцей, у якіх цепліцца іскра творчага агню — незалежна ад дастатку і сацыяльнага статусу іх бацькоў. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы ў Палацы Рэспублікі з навучэнцамі — пераможцамі міжнародных прадметных алімпіяд, творчых конкурсаў і фестываляў, лаўрэатамі спецфондаў кіраўніка дзяржавы па падтрымцы адораных студэнтаў і таленавітай моладзі.

«Ствараючы нашу маладую суверэнную дзяржаву, выпрацоўваючы сваю арыгінальную мадэль развіцця, мы апіраліся і апіраемся на духоўныя сілы і творчы патэнцыял беларускага народа, яго здольнасці, інтэлект і працавітасць, — сказаў Прэзідэнт. — Невычэрпная скарбніца талентаў — вось сапраўднае беларускае багацце, галоўны рэсурс, дзякуючы якому наша краіна рана ці позна зойме лідзіруючыя пазіцыі ў свеце».



Фота БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў Беларусі ўдалося захаваць і развіць агульнадаступную сетку гімназій і ліцэяў, школ мастацтваў, гурткоў, студый і самадзейных калектываў. Масавы характар набыў алімпіядны рух. Моладзь з годнасцю прадстаўляе Беларусь на міжнародных інтэлектуальных і творчых спаборніцтвах, выстаўках і конкурсах па ўсіх відах мастацтва.

Раскрыццю патэнцыялу моладзі садзейнічае дзейнасць спецыяльных фондаў кіраўніка дзяржавы, якія былі створаны ў хуткім часе пасля выбрання Аляксандра Лукашэнкі Прэзідэнтам у 1994 годзе. За 15 гадоў лаўрэатамі і стыпендыятамі прэзідэнцкіх спецфондаў сталі больш як 22 тыс. маладых людзей, педагогаў і творчых калектываў. Адшукаўшы талент, мы не выпускаем яго з-пад увагі, а дапамагаем дасягнуць тых вышынь здольнасцяў, якія закладзены прыродай, адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Нямногія краіны могуць сказаць, што ведаюць усіх сваіх таленавітых дзяцей пайменна. А ў Беларусі створаны спецыяльныя банкі звестак адоранай і таленавітай моладзі. І попыт на людзей, якія лічацца ў гэтых банках звестак, вялізны», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Вам дадзены ўсе магчымасці для асобаснага росту і дасягнення дасканаласці ў любімай справе. Галоўнае — правільна распарадзіцца імі, не зарыць бязмэтна свае таленты ў зямлю, а паспяхова рэалізаваць іх на Радзіме і з карысцю для грамадства», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. «Калі ж вы захочаце рэалізаваць сябе за мяжой на карысць сваёй Радзімы — я таксама супраць не буду», — дадаў ён.

Кіраўнік дзяржавы павіншаваў маладых людзей з завяршэннем навучальнага года і пажадаў ім здароўя, натхнення, поспехаў у вучобе, працы і творчасці. Аляксандр Лукашэнка ўручыў юнакам і дзяўчатам пасведчанні і нагрудныя знакі лаўрэатаў Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі і Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Запрашальнік

## ДЗЕНЬ З БАГДАНОВІЧАМ

*У памяць пра паэта адслужаць у царкве*

У Саборы святых Пятра і Паўла ў Мінску 25 мая а палове на другую адбудзецца памінальная служба. Гэта дзень, калі паэта не стала — у 1917-м. Але вось дзіва: кароткае яго жыццё, але вельмі напоўненае сэнсам, гармоніяй слоў, імкненнем да Беларусі, зрабіла яго імя жывым. А яго слова — жыццядзейным. Нават зараз. Шанаваць Максіма Багдановіча — значыць чытаць яго вершы. Ці прынесці кветкі да яго помніка (каля Нацыянальнага акадэмічнага вялікага тэатра оперы і балета) — сёння а 12-й гадзіне там збяруцца людзі з гэтай нагоды. А можна прыйсці ў літаратурны музей Багдановіча на вечарыну «У краіне светлай». Дарэчы, да 31-га мая экспануецца першы жывапісны партрэт паэта, створаны Валянцінам Волкавым.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «АВТОМАГИСТРАЛЬ» (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже единым лотом зданий, сооружений, передаточных устройств и оборудования, расположенных в районе д. Василевщина Березинского района Минской области в составе:

*административно-бытовой корпус, об. пл. 376,7 кв.м; склад, об. пл. 631,0 кв.м; котельная, об. пл. 108,5 кв.м; склад, об. пл. 46,0 кв.м; здание разметочных материалов, об. пл. 165,1 кв.м; автовесовая, об. пл. 26 кв.м; пожарный резервуар; канализационно-очистные сооружения; водонапорная башня; артскважина; наружные сети водопровода; благоустройство территории и др.* Начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 428 027 094 бел. руб. Площадь земельного участка 3,2985 га. Задаток 50 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.02.2010. Аукцион состоится **08.06.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.06.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

Минский городской центр недвижимости

МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ

ИНФОРМИРУЕТ

в заголовке таблицы извещения о проведении 31 мая 2010 года открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды специфических сооружений для установки объектов сезонной мелкорозничной торговли квасом в весенне-осенний период в г. Минске опубликованного в газете «Звязда» 15 мая 2010 года вместо слов «плодоовощной продукцией» **читать «квасом»**.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ МИНСКОГО ОБЛАСТНОГО СОЮЗА ПОТРЕБИТЕЛЬСКИХ ОБЩЕСТВ (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже единым лотом объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 11а, в составе:

административно-хозяйственное здание (инв. № 500/С-40517), об. пл. 117,2 кв.м, здание складов (инв. № 500/С-40518), об. пл. 666,9 кв.м. Начальная цена с НДС – 1 800 000 000 бел. руб. Площадь земельного участка – 0,4111 га. Задаток в сумме 100 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 15 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, ***если иное не предусмотрено договором купли-продажи.*** Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **29.06.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 28.06.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

### СЯДЗЕЛА НА ЛАЎЦЫ БАБУЛЯ...

Сумна закончылася святкаванне Міколы ў в. Заполле Ляхавіцкага раёна. У гэты дзень пенсіянерка сядзела на лаўцы каля плоту, і калі на яе выскачыла легкавушка, то не паспела ўсхапіцца. Вадзіцель не справіўся з кіраваннем на крутым павароце і знёс плот і лаўку, на якой сядзела бабуля. Жанчына загінула.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# РАКІРОЎКА ПА-ПАРЛАМЕНЦКУ

**Месца Барыса Батуры ў Савеце Рэспублікі заняў яго былы намеснік Анатоль Рубінаў, ранейшы пост Рубінава дастаўся Леаніду Крупцу, а пасада Крупца цяпер у Батуры. А зараз так, каб было зразумела: нядаўнім рашэннем Прэзідэнта Барыс Батура прызначаны губернатарамМіншчыны, а на нядаўнім пасяджэнні верхняй палаты парламента сенатары абралі новым старшынёй Анатоля РУБІНАВА, а яго намеснікам — Леаніда КРУПЦА (прычым аднагалосна).**

Абедзве кандыдатуры прапанаваў экс-кіраўнік Савета Рэспублікі Барыс БАТУРА (яго адстаўку сенатары таксама прынялі падчас свайго пасяджэння). Свайго былога намесніка ён назваў «прафесіяналам з вялікай літары», за плячыма якога — велізарны вопыт. У асабістым плане ён ахарактарызаваў яго як найсумленнейшага і чулага чалавека, маўляў, для Савета Рэспублікі «жадаць лепшага не трэба».

Анатоль Рубінаў назваў прапанову аб сваім вылучэнні «нетрывіяльнай», паколькі «не заўсёды кіраўнік хоча бачыць на сваім месцы намесніка». І ў сваю чаргу высока ацаніў дасягненні былога старшыні: механізм работы Савета Рэспублікі «як у найлепшым швейцарскім гадзінніку» — усё дакладна, без збояў, задачы вырашаюцца. Акрамя таго, зададзеная высокая планка, якую ён будзе старацца не апусціць.

На думку новага спікера, асноўная задача парламентарыяў — садзейнічаць руху ў кірунках, абазначаных кіраўніком дзяржавы ў Пасланні. Расстаўленыя А. Рубінавым і асноўныя акцэнты: прыцягненне знешніх інвестыцый, развіццё малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, умацаванне сацыяльнай структуры грамадства. Ён пераканаты, што сенатары павінны працаваць на месцах для таго, каб вызваліць краіну «ад бюракратычных путаў». Асаблівую ўвагу ён надае прэзідэнцкай кампаніі, якая мае адбыцца. Сенатары павінны прыкладаць максімум намаганняў, каб у супрацоўніцтве з мясцовымі ўладамі зняць наяўныя праблемы, «растлумачыць людзям нашу палітыку — чаму робіцца так, а не інакш».

Папрацаваць давядзецца і пры стварэнні Асацыяцыі мясцовых Саветаў. Гэта будзе двухузроўневая структура. Плануецца заснаванне нацыянальнай асацыяцыі, нешта накшталт з'езда Саветаў.

Прапаноўваючы кандыдатуру Л. Крупца, экс-спікер адзначыў уласцівы яму, «нягледзячы на маладосць, найбагацейшы прафесійны вопыт». А работа, якая праводзілася ім у такім адказным рэгіёне, заслугоўвае «ўхвалення і павагі».

Што ж, кіраўніцтва верхняй палаты абранае, і першае пасяджэнне ў новым складзе ўжо не за гарамі — у найбліжэйшую пятніцу.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

«Еўрабачанне-2010»

## ДЭБЮТНЫ СПЕЎ — ЁН ЦЯЖКІ САМЫ?

**СЁННЯ ў прыгарадзе Осла Балруме на сцэне спартыўна-канцэртнага комплексу Telenor Arena афіцыйна распачынаецца конкурсная частка 55-га міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне-2010». Сёлета, як і апошнія некалькі гадоў, яна складаецца з двух паўфіналаў (25, 27 мая) і фіналу (29 мая). Усяго на конкурсную пляцоўку выйдуць прадстаўнікі 39 краін свету, але сёння хвалююцца за «сваіх» першыя 17 — у тым ліку і Беларусь.**

СТАР. 3

### ДАЎ ЗАДНІ ХОД...

49-гадовы вадзіцель на тэрыторыі прадпрыемства «Баранавіцкі завод аўтаматычных ліній» рамантаваў аўтамашыну ГАЗ-53. Ён стаяў перад аўтамабілем, капот якога быў падняты. У гэты час другі вадзіцель на грузавіку даў задні ход і заціснуў калегу паміж аўтамашынамі. Вадзіцель загінуў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# КУСТ




Карэнная жыхарка вёскі Пласток Марыя СУШЧЭНЯ ў карагодзе побач з Кустом

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Тройцу з ваджэннем Куста на Любаншчыне пачалі святкаваць адносна нядаўна. Толькі чацвёрты год, як гэты абрад вернуты, можна сказаць, з небыцця. Па вялікай выпадковасці пра яго даведаўся фалькларыст Сяргей Выскварка, ён літаральна «зачапіўся» за словы, запісваючы песні ў сваёй вёсцы Пласток: «Ой, Тройца, Тройца, Багародзіца. Пасеем жыта, ды няхай зародзіцца».**

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.05.2010 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 995,00 | 1 чэшская крона | 145,21 |
| ▼ 1 еўра | 3 742,85 | 1 польскі злоты | 907,92 |
| 1 латвійскі лат | 5 263,16 | ▲ 1 расійскі рубель | 97,00 |
| 1 літоўскі літ | 1 078,31 | 1 украінская грыўня | 375,64 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 30,8754 |
| 10 UAH | 38,7249 |
| 1000 BYR | 10,3055 |
| EUR | 38,6159 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

Для всех форм собственности. Для любых целей

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОСТИ

| № лота | Наименование объекта и краткая характеристика | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Здание лесопильного участка. Одноэтажное кирпичное здание, общей пл. 533,8 кв.м. | 178 496 000 | 17 850 000 |
| 2 | Электроталь г/п 1 тн | 1 071 000 | 107 000 |
| 3 | Сварочный трансформатор ВД-301 | 669 000 | 67 000 |
| 4 | Сварочный трансформатор ТД-500 | 876 000 | 88 000 |
| 5 | Фуговальный станок СФ-4 | 3 261 000 | 326 000 |
| 6 | Станок круглопильный ЦА-2 | 2 920 000 | 292 000 |
| 7 | Станок рейсмусовый односторонний СРЗ-3 | 1 630 000 | 163 000 |
| 8 | Станок шипорезный ШО 16-4 | 3 930 000 | 393 000 |
| 9 | Станок шлифовальный ШАП-2М | 1 314 000 | 131 000 |
| 10 | Станок 4-сторонний строгальный С-26-2 | 8 624 000 | 862 000 |
| 11 | Станок зарезной н/с | 153 000 | 15 000 |
| 12 | Станок фрезерный ФА-4 | 2 875 000 | 287 000 |
| 13 | Сверлильно-долбежный станок н/с | 1 032 000 | 103 000 |
| 14 | Станок настольный сверлильный н/с | 915 000 | 91 000 |
| 15 | Кран укосина (без учета стоимости электротали) | 3 281 000 | 328 000 |
| 16 | Вагонетка сушильная | 539 000 | 54 000 |
| 17 | Вентилятор ЦП7-40 № 8 | 1 654 000 | 165 000 |
| 18 | Вентилятор ЦП7-40 № 8 | 1 654 000 | 165 000 |
| 19 | Оборудование для сушки (сушильная камера ПАП-32,3) | 6 226 000 | 623 000 |
| 20 | Раскроечный нож 73 № 4-2 | 1 857 000 | 186 000 |
| 21 | Тележка н/с (2 шт.) | 427 000 | 43 000 |
| 22 | Рольганг н/с | 630 000 | 63 000 |
| 23 | Кран козловой 3,2 тн н/с | 24 330 000 | 2 433 000 |
| 24 | Станок фрезерный ФА-4 | 2 875 000 | 287 000 |
| 25 | Маятниковая торцовочная пила н/с | 1 754 000 | 175 000 |
| 26 | Пилорама РМ-65-4А | 5 412 000 | 541 000 |
| 27 | Станок круглопалочный (055/4) (КПА-50) | 4 141 000 | 414 000 |

**Продавец имуществ:** Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при администрации Новобелицкого района г. Гомеля. Адрес объекта продажи: **г. Гомель, ул. 2-ая Орудийная, 15А**. Условия продажи: без условий. Цена указана без НДС. Шаг аукционных торгов – 5 %, вознаграждение – 5 % от цены продажи лота.

Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Документы, представляемые для участия в аукционе: заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; индивидуальным предпринимателям – копию свидетельства о государственной регистрации; представителям физических лиц – нотариально заверенную доверенность, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **До 17.00 23 июня 2010 г.,** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **24 июня 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Номер р/с для перечисления залога** | Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509 |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 37 27, 77 52 87 (факс).**

# ЦІ ДОЙДУЦЬ РУКІ ДА ДАЎГАБУДА НА ПАРТЫЗАНСКІМ ПРАСПЕКЦЕ?

Погляд

## Пакуль чыноўнікі ў роздуме, воднае пола ў сталіцы рызыкуе ператварыцца ў пляжны валейбол



**Больш за ўсё ў гэтай гісторыі здзіўляе тое, што на адным з цэнтральных праспектаў сталіцы, побач са станцыяй метро, знаходзіцца даўгабуд. Сотні квадратных метраў плошчы, мармуровая плітка (!) на падлозе ў вестыбюлі, сценах і вінтавой лесвіцы. І ў той жа час горы зусім не будаўнічага смецця, адсутнасць вокнаў і дзвярэй, часткова знятая кімсьці для ўласных патрэб плітка з падлогі, яна ж скрозь размаляваная на сценах графіцістамі. Рэтра-малюнак з сумбурных 90-х, які мы паспелі прызабыць. Усё гаворыць пра тое, што будынак зараз нічый, выкарыстоўваецца прыхільнікамі гульні «Схватка», мясцовымі выпівохамі ды наркаманамі.**



Фота Аляксандра КРАЎЦА.

Па ironii лёсу, калісьці яму было наканавана стаць Палацам спорту Заводскага раёна. Пачыналі яго будаваць яшчэ ў 80-х, але і праз амаль 30 гадоў так і не скончылі. У нейкіх сотнях метраў, на Партызанскім праспекце, нядаўна адкрывалі стэлу героям-партызанам. Усё побач было прыведзена ў ідэальны парадак, але гэтаму «аб'екту звышнарматыўнага незавершанага будаўніцтва» зноў «не пашчасціла» — ён стаіць крыху ў баку ад праспекта, замаскіраваны ў прамзоне і схаваны дрэвамі, якія за 30 гадоў паспелі тут вырасці. Прычым не толькі побач са сценамі, але і на даху. А побач за гэты час паспеў вырасці і сучасны будынак адной з рэлігійных канфесій — як іранічны кантраст адносінаў да дзяржаўнага (пабудаванага на бюджэтныя сродкі) і прыватнага.

Насамрэч у праблемнага будаб'екта ёсць і ўласнік — пасля гульняў у «гарачую бульбачку» ён у рэшце рэшт перададзены Упраўленню па фізічнай культуры, спорце і турызме Мінгарвыканкама. І справа па яго завяршэнні ледзь не распачалася летась. Прычым наканавана яму было выконваць ролю самую высакародную — тут павінна была размясціцца сталічная ДЮСШ-4 па водным пола. Нават праект будаўніцтва басейна ляжыць у кабінеце яе **дырэктара Аляксандра БАРЫСЕНКІ.** Аляксандр Барысавіч праводзіць мне экскурсію сярод смецця пад струменьчыкамі вады са столі і паказвае грандыёзных памераў залу з чашай басейна, закіданай пустымі пластыкавымі бутэлькамі. Ён марыў (і дагэтуль застаецца аптымістам) перабудаваць басейн (а перабудоўваць яго трэба ў любым выпадку — за гады ў статусе даўгабуда сваю справу зрабілі скразнякі, вада і неабароненасць ад надвор'я). Прычым зрабіць яго выключна для воднага пола, непрыдатным для плыўцоў. Тлумачыцца гэта і тым, што аднойчы ўжо ўзведзеную ў тым ліку і для ватэрпалістаў базу імкліва акупавалі плыўцы, якія выжылі адтуль воднае пола (але пра гэта ніжэй). Яшчэ і тым, што Аляксандр Барысавіч, які ўсім сэрцам перажывае за від спорту, якому аддаў 30 гадоў, за школу. І дабіваецца будаўніцтва базы выключна для дзяцей, для школы, гісторыя якой адлічыла больш чым паўвекавы рубеж, а не з нейкімі меркантыльнымі мэтамі. Таму калі ў згаданым даўгабудзе па Партызанскім праспекце, 146 Б калі-небудзь і будзе басейн, то, згодна з задумамі Аляксандра Барысенкі, памерам 20х30, як стандартнае поле для воднага пола, а вышкі і тумбы, узведзеныя тут калісь для скачкоў у ваду, будуць знесеныя.

Гісторыя пакутаў ДЮСШ-4 пачалася некалькі гадоў таму. Школа перайшла з гарадскога ў раённае падпарадкаванне, да ўпраўлення па адукацыі адміністрацыі Заводскага раёна сталіцы. Выхаванцы займаліся ў басейне гімназіі № 14, дзе традыцыйна развівалася воднае пола.

*— Прапрацавалі няпоўных чатыры гады. Мы лічылі, што гэта тое месца, дзе мы замацаваліся на нейкі час. Але басейн не новы, у адзін выдатны дзень прыйшла камісія, басейн зачынілі на рамонт, — расказвае Аляксандр Барысенка. — Тут і пачаліся нашы пакуты. Цяпер наша школа знаходзіцца па ўсім горадзе — на Ваўпшасава, 23, там наша першапачатковая падрыхтоўка, на Філімонава, 55 — сярэдняе звяно, і на птушыных правах мы знаходзімся ў Гарадскім цэнтры водных відаў спорту па вуліцы Герояў 120-й дывізіі, але гэта толькі адзін дзень на тыдзень, у нядзелю.*

Дарэчы, Гарадскі цэнтр водных відаў спорту, пра які вышэй мы згадвалі, будаваўся у тым ліку і для воднага пола (ён быў уведзены тры гады таму).

*— Падчас цырымоніі адкрыцця там былі ватэрпалісты і наш трэнер. Адбылася нават гутарка ў тым плане, што цяпер мы павінны быць задаволеныя: у нас нарэшце з'явілася база, цяпер ёсць дзе трэніравацца. Спачатку мы і сапраўды мелі 2 дарожкі 2 гадзіны кожны дзень на тыдзень. Прайшло тры гады. Мы маем 2 гадзіны раз на тыдзень, у нядзелю, — канстатуе дырэктар ДЮСШ-4.*

У чым прычына такіх адносінаў да алімпійскага, між іншым, віду спорту, Аляксандр Барысенка растлумачыў. — *Воднае пола — клапотны від спорту. Гэта мячы, вароты. З плыўцамі куды прасцей, яны і акупіравалі там усё. Дырэктару цэнтра Сяргею Матвіенку там наш від спорту не патрэбны — яны зрабілі гарадскі цэнтр па плаванні. У скачковым басейне можна працаваць, ён стаіць пусты ў асноўным, або купальшчыкаў запускаюць. Дык пусціце ватэрпалістаў! Не, адказваюць, парвяце дарагое пакрыццё... Нядаўна мы праводзілі турнір, да нас прыехалі каманды з Расіі, Літвы. У гарадскім цэнтры па плаванні зрабілі ўсё, каб нас туды не пусціць. Хоць я прасіў выдзеліць нам час хаця б з 11 вечара да 2 ночы. У выніку за два дні да спаборніцтваў, калі былі заказаныя гасцініцы, транспарт, праводзіць турнір не было дзе. Дзякуй, што ў апошні момант пайшло насустрач кіраўніцтва басейна на Філімонава, 55...*

*— Пазалетась, у канцы жніўня, на трэнерскім савеце, калі мы сабраліся перад новым навучальным годам, у мяне было нуль гадзін «вады» па ўсім горадзе, — працягвае Аляксандр Барысенка. — А трэнеры ў чым вінаватыя? Яны прыйшлі на працу своечасова, гатовыя працаваць... І ў мяне няма ўпэўненасці, што так не будзе ў наступным навучальным годзе, што застанецца тое, што ёсць сёння. Канкрэтны прыклад: 137-я школа Першамайскага раёна, дзе мы прапрацавалі 3 гады, сказала нам: да пабачэння, «вады» мы вам больш не дадзім. А што значыць дзесьці прапрацаваць? Гэта значыць, што там мы «абраслі» дзецьмі, з іншага канца горада ніхто ж ездзіць не будзе. Прыходзіцца шукаць новае месца, набіраць там новых навучэнцаў — час страчаны, дзеці страчаныя, нават цэлыя ўзросты страчаныя.*

Чаму так паступаюць ва ўстановах, якім належыць басейн, з навучэнцамі школы алімпійскага рэзерву? Таму што куды зручней зачыніць басейн на выхадныя, а раніцай у панядзелак адчыніць. Спартыўная секцыя — гэта ж заняткі да дзевяці, а то і да 11 гадзін вечара. І ў афіцыйным пісьме растлумачыць адмову тым, што басейну ў бліжэйшай будучыні патрэбны рамонт і рэканструкцыя.

Аляксандр Барысавіч кажа, што свайму пераемніку, калі такі з'явіцца, пажадае адзінае — уласны басейн. Хоць сам ён ніколі не здаваўся і не збіраецца. На пачатку сустрэчы ён паказвае мне публікацыі пра сітуацыю ў сваёй школе ў шэрагу выданняў. «Што-небудзь пасля гэтага змянілася?» — пытаю. Чую ў адказ, што нічога, дырэктару школы ніхто з «зацікаўленых» чыноўнікаў нават не патэлефанаваў. Ён дэманструе мне пухлую папку са сваімі зваротамі ў самыя розныя высокія інстанцыі. Наўздагад адгортвае старонкі: начальніку ўпраўлення па фізічнай культуры, спорце і турызме Мінгарвыканкама, намесніку кіраўніка адміністрацыі Заводскага раёна, старшыні камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама... Далей ідуць звароты бацькоў. Яны таксама не ў лепшым становішчы.

*— Маці вязе дзіця на тралейбусе зімой, у слоту ці мароз, праз шмат прыпынкаў на Ваўпшасава, дзе ў нас займаюцца пачаткоўцы. Пасля заняткаў выцірае яго, імкнецца неяк высушыць, і яны адпраўляюцца назад... Я не магу нават спецклас набраць. Спецклас — гэта двухразовыя трэніроўкі, харчаванне. Набяром мы дзяцей, а праз год мне скажуць: да пабачэння, басейн зачыняем на рэканструкцыю. Як я буду выглядаць перад бацькамі, якія даверылі мне дзяцей? Куды іх потым — вярнуць у звычайную школу?*

Насуперак абставінам выхаванцы школы дэманструюць нядрэнныя вынікі. Аляксандр Барысенка расказвае, што на нядаўніх рэспубліканскіх спаборніцтвах яго школа заняла другое месца. 20 выпускнікоў і выхаванцаў мінскай ДЮСШ-4 уваходзяць у розныя склады нацыянальнай зборнай.

*— Такое ўражанне, быццам бы дзеці, якія займаюцца ў школе, — а іх, між іншым, 288 — толькі мае. Я звяртаўся ўсюды, але справа не зрушылася. Усё гэта нагадвае адбіванне мяча ад сцяны. І прабіць гэтую сцяну, як часам здаецца, нерэальна. Гэта не праца, а выжыванне. Адзіная надзея была на даўгабуд на Партызанскім, 146. І летась, калі справа зрушылася, мы кожны чацвер збіраліся на нарады. А потым яны раптам перапыніліся. Тэлефаную і пытаю: «Чаму мы больш не збіраемся па чацвяргах?» — «Сам хіба не разумееш? Крызіс...»*

Той факт, што дзіцяча-юнацкая спартыўная школа, якая існуе ў сталіцы з 1954 года, дагэтуль не мае сваёй базы, не можа, мякка кажучы, не здзіўляць. У сучасных рэаліях, калі шмат будуецца спартыўнай інфраструктуры — палацаў, басейнаў, манежаў, арэн і пляцовак, гэта выглядае парадаксальна. Чаму аб'ект, на будаўніцтва якога затрачаныя немалыя грошы (не менш чым месячны бюджэт Заводскага раёна) цяпер папросту закапаны ў зямлю), нельга нарэшце дабудаваць? Чаму даўгабуд нельга ўключыць у інвестыцыйную праграму на, скажам, 2009—2012 гады? Пры тым, што яшчэ ў 2007 годзе даручана Мінгарвыканкаму ўсе сталічныя праблемныя будаб'екты давесці да стадыі завяршэння.

Дарэчы, галоўны архітэктар сталіцы, старшыня Камітэта па архітэктуры і горадабудаўніцтве Мінгарвыканкама Віктар Нікіцін зноў-такі па іроніі лёсу з'яўляецца куратарам воднага пола ў Мінгарвыканкаме. Але трапіць да яго на прыём у Аляксандра Барысенкі не атрымалася. А пытанні засталіся. Чаму ўласнік аб'екта — Упраўленне па фізічнай культуры і спорце Мінгарвыканкама — не прымае ніякіх захадаў для надання будынку статусу завершанага? Чаму нарэшце ў федэрацыі воднага пола дагэтуль не зразумелі, што дзіцячая школа — падмурак, аснова той піраміды, на якой грунтуецца нацыянальная каманда?

Такіх «чаму» яшчэ шмат. А вось у даўгабудзе на Партызанскім праспекце на ўсю сцяну хтосьці з графіцістаў вывеў філасофскае «Зачем?». «Навошта?» — пытанне актуальнае і характэрнае. Яго квінтэсенцыя прыкладна такая: навошта імкнуцца жыць лепш, калі і так можна? Навошта дабудоўваць, зносіць і перапрафіляваць, калі і так можна? Хочацца, каб чыноўнікі ўсё ж знайшлі на яго адказ.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

КІРМАШ — штотыднёвы рэкламны выпуск № 10 (635)

аддзел рэкламы 287 17 79

### ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

***ПРАДАЕЦЦА***

❐ Зруб, б/к (15 х 8), разабраны ў р-не р. Нёман в. Беражная Карэліцкага раёна.

Маб. Velkom 3461663, 3461632.

❐ А/м Міцубісі-Спэйс-Стар 2002 г.в., 1,9D.

Тэл. 8 029 7887950 (МТС).

❐ Фіят-тэмпра, 1994 г.в., 1,6, бензін.

Тэл. маб. 604 12 31 (МТС).

❐ А/м ВАЗ-2106, 1987 г.в., у добрым стане, прычэп «Зубраня» без афармлення і новыя дыскі для а/м.

Тэл. 8(017) 503 13 09, маб. 8 029 173 43 60.

❐ Казёл 14 месяцаў, в. Дуброўка Браслаўскага раёна Віцебскай вобл.

Тэл. 8 02153 23370.

❐ Дом на беразе возера ў Лепельскім раёне.

Тэл. 8 029 861 39 89.

ЗВЯЗДА

**КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

**Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:**

**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.**

Пашпарт, серыя______ №____________ Выдадзены ______________________

Подпіс _________________ Дата _________

«Еўрабачанне-2010»

# ДЭБЮТНЫ СПЕЎ — ЁН ЦЯЖКІ САМЫ?

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Адкрыюць першы паўфінал «Еўрабачання» прадстаўнікі Малдовы SunStroke Project і Оля Ціра (апошняя ў 21 год — ужо вопытны баец «Еўрабачання», удзельнічала ў нацыянальных адборах з 2006 года), а завершыць — спявачка з Ісландыі Хера Б'ёрк (таксама не навічок на конкурснай сцэне — на «Еўрабачанні» выступала ўжо двойчы, а цяпер упершыню выйдзе ў якасці салісткі). Пад нумарам 2 выступіць расіянін з балканскімі каранямі Пётр Наліч, у поспех якога нават самі расіяне чамусьці не вераць. Далей шоу працягнуць артысты з Эстоніі, Славакіі, Фінляндыі, Латвіі, Сербіі (з песняй не каго-небудзь, а знакамітага Горана Брэгавіча), Босніі і Герцагавіны, Польшчы, Бельгіі, Мальты, Албаніі, Грэцыі, Партугаліі, Македоніі. Нашы ўдзельнікі, гурт «3+2», з магутнай музычнай артылерыяй у асобе шведскага кампазітара і піяніста Роберта Уэлса, выканаюць песню аўтарства расійскага прадзюсара Макса Фадзеева і польска-амерыканскай паэткі Малькі Чаплін «Butterflies» перадапошнімі, пад нумарам 16.

Конкурсная пастаноўка беларусаў, дарэчы, крыху змянілася. Па просьбе нашай дэлегацыі пасля першай рэпетыцыі арганізатары прыбралі са сцэны дэкарацыі, што імітавалі тэатральныя падмосткі, і памянялі фон — цяпер адначасова з трансфармацыяй дзявочых касцюмаў у матылькоў зверху запальваецца «зорнае неба», а на фінальных акордах выкарыстоўваюцца канфеці і дымавыя эфекты.

Але ўсё гэта дасць эфект, падкрэсліваюць вопытныя назіральнікі, толькі ў сукупнасці з бездакорным выкананнем песні і з такім ірацыянальным фактарам, як звычайнае шанцаванне. Не забываемся: сёлета ў паўфіналах выкарыстоўваецца схема галасавання 50/50 — сімпатыі гледачоў плюс меркаванне нацыянальных журы, таму «добрасуседскі фактар» будзе зведзены да мінімуму. Але ўвогуле скідваць яго з рахункаў не варта: магу паспрачацца з кім заўгодна, што Беларусь атрымае пэўныя балы ад Расіі, Латвіі, Польшчы, Малдовы і Эстоніі, а мо яшчэ ад Мальты і Грэцыі. Праўда, хто, каму і колькі адшкадуе, мы даведаемся толькі пасля фінальнага шоу: паводле правілаў конкурсу, у паўфіналах балы не абвяшчаюцца, дзясятку шчаслівчыкаў, якія праходзяць у фінал, проста называюць вядучыя шоу.

А вось у фінале вынікі галасавання кожнай краіны абвяшчаюць спецыяльна абраныя вяшчальнікі — ад Беларусі такім абраны алімпійскі чэмпіён фрыстайліст Аляксей Грышын. Каментаваць жа ўсе тры конкурсныя дні па традыцыі будзе спецыяльны карэспандэнт Агенцтва тэленавінаў Белтэлерадыёкампаніі Дзяніс Кур'ян. Прамыя трансляцыі 55-га міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне-2010» адбудуцца на Першым канале і спадарожнікавым тэлеканале «Беларусь-ТБ».

### Як галасаваць?

Магчымасць тэлегаласавання ў гледачоў з'явіцца з пачаткам выступлення першага ўдзельніка і працягнецца яшчэ 15 хвілін пасля выступлення апошняга. Вызначыўшыся са сваімі сімпатыямі, аддаць свой голас за таго ці іншага ўдзельніка (акрамя прадстаўнікоў сваёй краіны) можна будзе, пазваніўшы па нумарах, якія з'явяцца на экране. Важны момант: галасаванне платнае! Кошт званка з хатняга тэлефона, паведамілі ў РУП «Белтэлекам», складае 1000 рублёў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## З МІЛІЦЫЯЙ ЖАРТЫ КЕПСКІЯ

**Пажартаваць з міліцыяй, справакаваць яе супрацоўнікаў на фальшывы выклік аматараў хапае. Сёлета ў Баранавіцкім раёне ўжо былі 53 несапраўдныя выклікі.**

За такое парушэнне можна атрымаць 140 тыс. рублёў штрафу, а хто такім чынам патрывожыў міліцыю двойчы, то пакаранне дасягае 700 тысяч. У асноўным жартуюць п'яныя. А ў бюджэт раёна за кошт штрафаў паступіла каля 9 млн рублёў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

| Наименование объекта | Лот № 1 | Лот № 2 | Лот № 3 | Лот № 4 | Лот № 5 | Лот № 6 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Целевое назначение** | Установка торгового павильона | Установка торгового павильона № 1 | Установка торгового павильона № 2 | Установка торгового павильона | Строительство и обслуживание жилого дома | Строительство и обслуживание жилого дома |
| **Местонахождение объекта** | г. Малорита, ул. Советская | г. Малорита, ул. Школьная | г. Малорита, ул. Школьная, | Малоритский район, д. Луково, ул Суворова, 59Б | г. Малорита, ул. Березовая, 18 | г. Малорита, ул. Восточная, 11 |
| **Продавец объекта** | Малоритский районный исполнительный комитет | | | | | |
| **Организатор торгов** | Малороитский районный исполнительный комитет | | | | | |
| **Начальная цена продажи, руб.** | 163920 | 849910 | 801730 | 84000 | 4185530 | 3159870 |
| **Сумма задатка, руб.** | 16390 | 84990 | 80170 | 8400 | 418550 | 315990 |
| **Характеристика объекта, площадь земельного участка (га), решение об отводе земельного участка, кадастровый номер** | 0,0036 га, решение Малоритского райисполкома № 472 от 23.04.2010 Кадастр. номер 125250100001002663 | 0,0020 га, решение Малоритского райисполкома № 1451 от 31.12.2009 Кадастр. номер 125250100001002616 | 0,0153 га, решение Малоритского райисполкома № 1452 от 31.12.2009 Кадастр. номер 125250100001002617 | 0,1490 га, решение Малоритского райисполкома № 485 от 27.04.2010 Кадастр. номер 125281302601000389 | 0,1421 га, решение Малоритского райисполкома № 401 от 14.04.2010 Кадастр. номер 125250100001002662 | 0,15 га, решение Малоритского райисполкома № 400 от 14.04.2010 Кадастр. номер 125250100001002661 |
| **Ограничения в использовании земельного участка** | В охранной зоне подземной кабельной линии электросвязи на площади 0,0024 га | В санитарно-защитной полосе водопровода на площади 0,0020 га | – | В водоохранной зоне озера Луковское вне прибрежной полосы на площади 0,1490 га | – | – |
| **Срок аренды земельного участка** | 10 лет | 10 лет | 10 лет | 50 лет | 50 лет | 50 лет |
| **Размер расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации (руб.)** | 1459823 | 1028161 | 1006502 | 1573138 | 1413560 | 1363462 |
| **Условия продажи** | 1. Внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка в течение 10 дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка | | | | | |
| | 2. Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формирования земельного участка, в т.ч. с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка | | | | | |
| | 3. Заключение победителем аукциона в 20-дневный срок после проведения аукциона с Малоритским районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения районного исполнительного комитета о передаче ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок | | | | | |
| | 4. Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий одного года. 5. Осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией. 6. По окончании срока аренды земельного участка совместно с райисполкомом в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования | 4. Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий одного года. 5. Осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 4. Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта | 4. Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта на срок не превышающий одного года. 5. Осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 4. Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения районного исполнительного комитета на строительство жилого дома. 5. Приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на него. 6. По окончании срока аренды земельного участка совместно с районным исполнительным комитетом в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования | 4. Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения районного исполнительного комитета на строительство жилого дома. 5. Приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на него. 6. По окончании срока аренды земельного участка совместно с районным исполнительным комитетом в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования |

Аукцион состоится **25 июня 2010 года в 11.00** по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1, каб. 64 (малый зал).

**Контактные телефоны в Малорите: (8 01651) 2 30 04, 2 30 01, 2 23 65.**

**Для участия в аукционе представляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с райисполкомом.

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3602223000219 ЦБУ № 120 АСБ «Беларусбанк», МФО 150501246, код платежа 04002, получатель платежа – районный бюджет, УНН 200077623.

3. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также заверенную копию платежного поручения о внесении задатка.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

4. Условием проведения аукциона является наличие не менее 2 участников.

**Заявления об участии в аукционе принимаются с 25 мая 2010 г. до 22 июня 2010 г. по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1, каб. 57, отдел экономики Малоритского райисполкома с 8.00 до 17.00 по рабочим дням.**

# КУСТ







*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Пра Куста мне расказала Праскоўя Муравейка, знаўца колішніх традыцый і незлічонай колькасці земляробча-абрадавых песень. Яна была сапраўднай скарбонкай народнай культуры — прыгадвае Сяргей Высkварка сваю старэйшую аднавяскоўку. — А фальклорны калектыў пластоцкага Дома культуры па ўспамінах узяўся за рэканструкцыю гэтай траецкай жаночай гульні-карнавала.

«Ой, былі мы ды ў вялікім лесе, ды звілі мы Куста з шырокага клёну», — спяваюць удзельніцы свята, убіраючы ў галінкі бярозы і кляновае лісце абранніцу на пасаду Куста. Валянціне Янкоўскай ужо другі раз даводзіцца прымяраць на сябе гэты незвычайны зялёны касцюм з вяночкам. У ім яна непазнавальная і схаваная ад дапытлівых вачэй. Таямнічая і загадкавая, як і павінен быць траецкі Куст — сімвал росквіту жыцця і ўрадлівасці зямлі, увасабленне сапраўднай прыгажосці прыроды, яе нязведанай і няскоранай моцы. Гэткім Куста павялі па вёсцы, каб пажадаць гаспадарам добрага плёну на хлебнай ніве, прыбытку ў сям'і, дабрабыту. Старэйшая жыхарка Пластка 85-гадовая Марыя Сушчэня з дзіцячай усмешкай на твары сустракала Куста каля сваёй брамы. Магчыма, яна ўзгадвала, як вадзілі Куста да вайны, у час яе маладосці. Можа, нават і сама была Кустом.

— Ад часоў вайны не спраўлялі ў нас Тройцу па старажытнай традыцыі, — тлумачыць Сяргей Высkварка. — Акупацыя зламіла дух людзей, забрала моц і жыццёвую радасць. Удовы і маці палеглых на фронце і ў партызанах сыноў не маглі болей спяваць вясёлыя і сцвярджальныя песні, радавацца жыццю. Любаншчына хоць гераічная і няскораная зямля, але колькі тут пагарэла вёсак! Толькі ў нашым Пластку засталіся чатыры хаты.

Па выглядзе сённяшняй вёскі не здагадаешся, што тут была выпаленая зямля і спынялася нават само жыццё. Магчыма, старэйшыя жыхары, якія прыйшлі паглядзець на свята, не верылі вачам, што Куст вярнуўся, ён зноў ідзе шырокай вуліцай і зноў, як некалі, гучыць песня:

***«Ой, выйдзі, пане, ды з новага дому, ды вынясі Кусту хоць па залатому»...***

— Мы хочам вярнуць гэтую прыгожую традыцыю, далучыць моладзь да спадчыны дзядоў і бабуль, — кажа дырэктар Дома культуры Соф'я Каток і прызнаецца, што ладзіць гэткія відовішчныя святы на адным энтузіязме — справа не з лёгкіх. — Бо цяпер такі час, што ўсе хочуць быць гледачамі, а не ўдзельнікамі. А Куст — гэта сапраўдны цуд, з'ява нашай народнай культуры!

Любанская Тройца адметная тым, што ў падчас абраду не толькі смажаць на вогнішчы яечню, але і вараць яйкі ў вялікім чыгуне, каб потым раздаваць іх як сімвал грамады, сваяцтва, еднасці. Яшчэ адным сімвалам моцнай вясковай сям'і з'яўляецца гульня «кумленне». Дзяўчынкі-падлеткі, маладзіцы і старэйшыя жанчыны-бабулі завязалі на бярозавыя галінкі стужкі — як бы далі своеасаблівае абяцанне заставацца і надалей прыяцелькамі, сяброўкамі і добрымі суседкамі. Звязвалі затым гэтыя каляровыя дрэўцы і хадзілі карагодам праз «вароты», трымаючыся за рукі і зноў спяваючы. А потым кідалі свае вяночкі на высокую бярозу.



Сёлета на Любаншчыне, як ні дзіўна, ужо закаласілася жыта і паднялося нават вышэй пояса. Напэўна, сёлетняе жніво прыйдзе сюды рана. Але што пра гэта загадзя загадваць. Час пакажа. Лепш хай будзе, як спяваецца ў траецкай песні: **«Няхай наша жыта ды ў полі буяе, няхай Куст наш ды па свеце гуляе!»**

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

## Дзве даты

**25 мая**

**1919 год** — заснавана Наваградская беларуская гімназіі. Яна працавала ў Наваградку ў 1919—1934 гадах. Гэта была сярэдняя навучальная ўстанова ў Заходняй Беларусі, якая падрыхтоўвала навучэнцаў да паступлення ў ВНУ. Выступала за захаванне беларускай нацыянальнай самабытнасці, павышэнне культурнага ўзроўню, выхаванне павагі да народных звычаяў і традыцый. Апроч беларусаў у гімназіі вучыліся рускія, татары, яўрэі. Утрымоўвалася за кошт платы за навучанне, ахвяраванняў грамадскіх арганізацый, вулічных збораў і інш. Тэрмін навучання складаў 8 гадоў. Выкладаліся беларуская, польская, французская, нямецкая, лацінская мовы, Закон Божы, гісторыя і геаграфія Беларусі і Польшчы, сусветная гісторыя і геаграфія, матэматыка, фізіка, хімія, прыродазнаўства, маляванне, спевы, праца, фізкультура і інш. Дзейнічалі аматарскія гурткі (танцавальны, літаратурны, драматычны, харавы, вакальны), аркестр, спартыўныя секцыі (па лёгкай атлетыцы, футболе, боксе, лыжная). Гімназія была зачынена польскімі ўладамі ў чэрвені 1934 года. Большасць навучэнцаў працягнулі вучобу ў Віленскай беларускай гімназіі, частка — у мясцовай польскай гімназіі імя А. Міцкевіча.



**1933 год** — у Мінску оперным спектаклем «Кармэн» Ж. Бізэ адкрыўся Дзяржаўны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі (з 1996 года — Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь).

## Цытата дня:

***«Праўда іншы раз гнецца, але ніколі не ломіцца і ўсплывае паверх хлусні, як масла — паверх вады».***

**Мігель дэ Сервантэс Сааведра (1547—1616), іспанскі пісьменнік.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.53 | 21.21 | 16.28 |
| Віцебск — | 4.36 | 21.18 | 16.42 |
| Магілёў — | 4.43 | 21.11 | 16.28 |
| Гомель — | 4.48 | 21.00 | 16.12 |
| Гродна — | 5.09 | 21.35 | 16.26 |
| Брэст — | 5.18 | 21.27 | 16.09 |

### Месяц

***Поўня 28 мая.***
***Месяц у сузор'і Стральца.***

### Імяніны

***Пр.*** *Германа, Дзяніса, Пятра.*

***К.*** *Віалеты, Магды, Барыса, Лявона, Рыгора, Урбана.*



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.




## Геаграфія дзелавога супрацоўніцтва: Польшча

**Прамысловасць. Энергетыка. Рэсурсы**

# ПОЗНАНЬ ЗАПРАШАЕ ПРАМЫСЛОЎЦАЎ І ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ

**У Познані — выставачнай сталіцы Польшчы — 8 чэрвеня адкрыецца найбуйнейшая ў гэтай краіне Міжнародная прамысловая выстава «ITM POLSKA — Інавацыі. Тэхналогіі. Машыны», удзел у якой возьмуць больш за тысячу фірмаў амаль з трыццаці краінаў свету.**



Як гэта відаць з назвы самой выставы, акцэнт у яе экспазіцыі робіцца на дэманстрацыю інавацыйных працэсаў і тэхналогій — у васьмі тэматычных раздзелах: ад сыравіны, прадукцыі і абсталявання для металургічнай прамысловасці да тэхнікі апрацоўкі паверхняў, гальванікі, зваркі, напылення, лакіравання і кантрольна-вымяральных прыбораў, Наведвальнікі гэтага дзелавога форума азнаёмяцца таксама з экспазіцыяй трох спецыялізаваных салонаў: «Транспарт для прамысловасці», «Навука для эканомікі», «Ахова працы ў прамысловасці». Арганізатары выставы прадугледзелі таксама ў дзелавой праграме цэлы шэраг спецыяльных прэзентацый: «Парк гідраўлікі і пнеўматыкі», «Інавацыйнасць на практыцы», «Парк ліцейнай справы», «Транспарт XXI стагоддзя», «Акадэмія зваркі».

Чакаецца, што гэты форум прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў наведаюць больш за дваццаць тысяч спецыялістаў, у тым ліку з Беларусі. У чарговы раз дэлегацыю беларускіх дзелавых колаў для наведвання «ITM — Інавацыі. Тэхналогіі. Машыны» фарміруюць Саюз юрыдычных асобаў «Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва» і грамадскае аб'яднанне «Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў». Удзельнікі гэтай паездкі змогуць скарыстацца на тэрыторыі выставы стэндам для прэзентацыі інфармацыі аб сваіх прадпрыемствах. Арганізатары выезду рыхтуюць таксама адмысловы буклет на польскай, англійскай і рускай мовах пра беларускіх прадпрымальнікаў, зацікаўленых у наладжванні міжнароднага дзелавога супрацоўніцтва. Гэты буклет будзе распаўсюджаны сярод экспанентаў і наведвальнікаў «ITM — Інавацыі. Тэхналогіі. Машыны».

Больш падрабязна пра гэты дзелавы форум і ўдзел у ім дэлегацыі беларускіх дзелавых колаў можна даведацца ў Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва і Мінскім сталічным саюзе прадпрымальнікаў і працадаўцаў па тэлефонах у Мінску: (017) 298 24 46, 298 24 38.

**Барыс ЗАЛЕСКІ.**



**Такой убачылі выставу «ITM — Інавацыі. Тэхналогіі. Машыны» беларускія прадпрымальнікі летась.**




## СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



# «Флютабс» і «Тусін» — толькі па рэцэптах

**Міністэрства аховы здароўя ўнесла важныя змены ў пералік безрэцэптурнага водпуску лекаў**

У прыватнасці, пералік лекавых сродкаў, якія адпускаюцца строга па рэцэпце ўрача, папоўнілі некалькі даволі папулярных у нашай краіне, асабліва падчас прастуднага сезону, прэпаратаў, у склад якіх уваходзіць такое рэчыва як дэкстраметарфан: гэта супрацькашлевыя сіропы «Глікадзін» (Індыя) і «Тусін Плюс»(ЗША), таблеткі «Колдапрым» (Індыя) і шыпучыя таблеткі «Парацэтамол ДМ» (Эстонія).

У чым жа, цікава, «правініўся» дэкстраметарфан (DXM)? Дастаткова толькі ўвайсці ў пошукавую сістэму інтэрнэту, як табе паведамяць, што «Тусін» — гэта «правільны наркаманскі сіроп ад кашлю, які паважаюць псіханаўты-пачаткоўцы з-за яго даступнасці, таннасці і сілы крышэння мозгу». Але як жа ў такім разе дэкстраметарфан трапіў у лекі? Яго асноўнае прызначэнне — падаўленне сухога кашлю, і ў рэкамендаваных для лячэння дозах гэта рэчыва бяспечнае і тэрапеўтычна эфектыўнае. Разам з тым з-за даступнасці ў аптэчных сетках супрацькашлевых сіропаў, якія ўтрымліваюць дэкстраметарфан, апошнія сталі найбольш распаўсюджанай сыравінай для вытворчасці незаконнага DXM.

Яшчэ адно лякарства, якім зацікавіліся беларускія праваахоўныя органы, гэта таблеткі для ўстаранення сімптомаў ВРВІ і грыпу «Флютабс» вытворчасці Med-Interplast Pvt. Ltd. (Індыя). У іх склад уваходзяць фенілпрапаналаміна гідрахларыд, парацэтамол, кафеін і хлорфеніраміна малеат. У інфармацыі, якая паступіла ў галоўнае медыцынскае ведамства з Міністэрства ўнутраных спраў, паведамляецца, што ў дадзены момант нарказалежнымі асобамі гэты прэпарат выкарыстоўваецца ў незаконным абарачэнні наркотыкаў. У саматужных умовах з фенілпрапаналаміна гідрахларыду атрымліваюць амфетамін — асабліва небяспечнае псіхатропнае рэчыва, не прызначанае для медыцынскіх мэтаў. Для таго, каб выключыць выкарыстанне «Флютабса» ў незаконным абароце наркотыкаў, Міністэрства аховы здароўя прапанавала арганізацыям аховы здароўя і аптэкам паставіць «Флютабс» пры яго наяўнасці на прадметна-колькасны ўлік і ажыццяўляць рознічную рэалізацыю гэтага лекавага сродку строга па рэцэптах урача («Флютабс» і раней быў рэцэптурным сродкам).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# АБРАД «КУСТ»

**У вялікім і багатым атласе асаблівасцяў беларускага традыцыйнага календара выключнае месца займае ўнікальны абрад «Куст», або «Ваджэнне Куста», які ў трансфармаванай форме захаваўся да нашага часу ў рэгіёне Заходняга Палесся, асабліва ў Пінскім раёне, а таксама ў памежных з ім раёнах.**

● Існаванне абраду было зафіксавана збіральнікамі фальклорнай спадчыны яшчэ ў XIX ст. Галоўным атрыбутам святочных падзей з'яўляецца ўсё тая ж зеляніна, пры гэтым галінка бярозы, на думку адных навукоўцаў, «лічыцца... месцам існавання нябачных душ, якія прыходзяць на зямлю ў памінальныя дні Траецкага цыкла», на думку іншых — галінка дрэва і ёсць само ўвасабленне гэтай душы.

● Траецкі абрад «Куст» праводзіўся наступны чынам. У першы або другі дзень Тройцы збіраўся гурт вясковых дзяўчат, які выбіраў самую прыгожую з моладзі перадшлюбнага ўзросту. Дзяўчаты ішлі ў лес і выконвалі там працэдуру рытуальнага пераапранання — перанараджэння абранай дзяўчыны. З яе здымалі ўсё адзенне і ўбіралі вянкамі з зеляніны. Вось гэтая пераапранутая-пераўвасобленая дзяўчына і атрымала назву «куст». Акрамя таго, кустом называлі сам абрад і паэтычны вобраз, які фігураваў у цыкле «куставых» песень.

● Дзяўчыну-Куст вялі ў вёску і з удзелам вялікай колькасці дзяўчат-аднагодкаў выконвалі абрадавы абход вёскі. У пэўнай ступені гэтае абрадавае дзеянне нагадвала абход вёскі калядоўшчыкамі. «Войско дэвоцкае» распачынала абход з якога-небудзь канца вуліцы, падыходзіла да аднаго з гаспадарскіх двароў і пачынала спяваць куставую песню, у змесце якой гучаў зварот да гаспадароў з просьбай што-небудзь падарыць Кусту.

● Гаспадары двара сустракалі гурт моладзі перад парогам хаты. На стале, які мог стаяць тут жа, перад парогам, або на ручніку гаспадыня трымала падарункі-ахвяраванні: хлеб, яйкі, грошы. Адна з удзельніц абходу прымала падарункі і складвала ў торбу. Кампанія дзякавала гаспадарам за падарункі і рушыла далей.

● Пасля таго, як абход вёскі будзе завершаны, гурт рушыў зноў-такі да таго месца, дзе дзяўчыну ўбіралі. Дзяўчына апранала на сябе звычайнае адзенне. А што адбывалася далей з зелянінай? У адным выпадку яе вешалі на калаўрот, якім са студні даставалі ваду, або проста раскідалі па зямлі, аднак не прасочвалася тэндэнцыя абавязковага знішчэння, як, напрыклад, з чучалам Масленіцы.

● Фінальным акордам святочнай урачыстасці была агульнавясковая вячэра ў адной з вялікіх хат. Спявалі песні, узгадвалі незвычайныя гісторыі, расказвалі пра выключныя выпадкі, якія здараліся ў мінулыя гады.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнемся!

У гасцініцы:

— Дзяўчына! Памяняйце мне пасцельную бялізну.

— Добра, з якім нумарам жадаеце мяняцца?

☺

**У бальніцы.**

**— А сёння я вам раскажу, як з хворых краснухай і жаўтухай скласці прыгожы ўзор...**

☺

— Я ўчора «Тытанік» з сяброўкай глядзеў.

— Праўда? І чым усё скончылася?

— Сэксам.

— Як так? Там жа, здаецца, усе патанулі?..

— Не ведаю, як у іх там, а ў мяне — сэксам!

Наблюдательный совет **ОАО «Світанак»** г. Жодино сообщает, что с 1 июля 2010 г. будет производиться выплата дивидендов акционерам ОАО «Світанак» по итогам работы за 2 полугодие 2009 г. УНП 600038919.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 2496. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12